Народная легенда “Дамавікова ўдзячнасць” (6 клас, 2 чвэрць)
Мэты: узнавіць і пашырыць веды і ўяўленні вучняў пра народныя легенды і іх жанравыя ўласцівасці; пазнаёміць з легендай “Дамавікова ўдзячнасць”, прааналізаваць характары і паводзіны герояў.
Тып урока:вывучэнне новага матэрыялу.
Прыёмы: “Ліст па крузе”, “Рамонак Блума”, “Параўнальная табліца”.
Ход урока.

I. **Арганізацыйны момант.**
II. **Праверка дамашняга задання.**
   - Творчае заданне на выбар: крыжаванка, малюнак або пераказ пра міфічную істоту.
   - *Прыём “Лісток па крузе”.* (Да слова Дамавік падбіраем словазлучэнні або сказы).

Дамавік – сівенькі дзядок, дамашні ахоўнік, любіць малако і цукеркі, сучасны палтэргейст, дапамагае людзям, жыў раней пад прыпечкам, б’е посуд, мае доўгую бараду, перастаўляе ў хаце рэчы, назірае за парадкам.

- У каго, як здавалася нашым продкам, мог пераўвасабляцца Дамавік?

(у вужа, змяю, жабу, ката ці сабаку). Чаму? (Заўсёды жылі разам з чалавекам, ахоўвалі яго; па іншых думках, дамавік – гэта і ёсць чалавек).
*Настаўнік.* Паводле вераванняў, усе змеі валодаюць прарочай сілай, незвычайнай мудрасцю; але толькі адзін вуж схільны прымяняць сваю мудрасць на карысць дому, дзе ён паселіцца. Пасяленне вужа ў доме лічылася добрым знакам, таму што ён прыносіў у дом шчасце. Але калі хатняга вужа раззлаваць – чакай няшчасця.

- Давайце ўспомнім, што такое легенда і якія жанравыя ўласцівасці яна мае.

Легенда – фантастычнае апавяданне, заснаванае на паэтызацыі гістарычных падзей і ўслаўленні народных герояў.
Жанравыя ўласцівасці легенды: багацце бытавых рэалій, даступнасць сюжэта, лаканізм формы, асноўны канфлікт, спосабы абмалёўкі герояў, размежаванне іх на станоўчых і адмоўных, павучальны змест, наяўнасць чарадзейных элементаў.

- Які жанр літаратуры мае такія ж уласцівасці і набліжаны да легенды? (Казка.)

Казка – займальны аповед пра неверагодныя і фантастычныя падзеі і прыгоды.

- Што збліжае легенды з казкамі, якая іх асноўная думка? (Дабро перамагае зло.)

*Прыём “Казачны калейдаскоп”.* (Заданне на суаднясенне ілюстрацый і назваў твораў.)

| | | | |
|---|---|---|---|
| А |  | 1 | Казка “Залаты птах” |
| Б |  | 2 | Легенда “Вужыны Цар” |
| В |  | 3 | Легенда “Нарач” |
| Г |  | 4 | Легенда “Дамавікова ўдзячнасць” |
| Д |  | 5 | Казка “Разумная дачка” |
| Е |  | 6 | Легенда “Пестунь” |

Адказ: А3 Б4 В6 Г1 Д2 Е5.

- Што падалося цяжкім для вызначэння? (Легенда “Дамавікова ўдзячнасць”, таму што раней не сустракаліся з гэтым творам.)

III. **Знаёмства з народнай легендай “Дамавікова ўдзячнасць”.**

- Выразнае чытанне настаўнікам слоў аўтара, а падрыхтаванымі вучнямі – чытанне па ролях .
- Лексічная работа са словамі прызба, голька, камора, залекацець, гладыш, кастрыца.

IV. **Аналіз легенды.**

*Прыём “Рамонак Блума”.*

- Назавіце галоўных герояў легенды. (Вуж-дамавік, дзеці, гаспадар з гаспадыняй, змяя.)
- Як адносіўся гаспадар і гаспадыня, дзеці да вужа-дамавіка? (Гаспадар не крыўдзіў яго; гаспадыня частавала цёплым малаком, а дзеці прымалі ў супольныя гульні.)
- Што здарылася, калі дзеці, гуляючы, знайшлі ў старой прызбе вужыныя яйкі? (Вуж перапужаўся, віўся каля дзяцей, імкнучыся адхіліць бяду, і жаласна сіпеў, каб дзеці не чапалі і не крыўдзілі яго дзетак; дзеці не разумелі вужынай мовы і прагналі вужа з падворка.)
- Што змянілася б, калі б дзеці не гулялі з вужынымі яйкамі? (Не адбылося б бяды.)
- Як вы аднесліся да ўчынка змяі? (Дрэнна.)
- Калі б вы апынуліся на месцы вужа, ці прынялі б дапамогу ад змяі? (Не, таму што змяя хацела знішчыць гаспадара і яго сям’ю; у цяжкай сітуацыі чалавек хапаецца за любую саломінку, але гэта не павінна адбывацца за кошт жыцця іншага чалавека.)

*Прыём “Параўнальная табліца”*

*Эпізод 1. Заданне 1 групе (можна па варыянтах).*

*Адносіны да ўчынка змяі. Паводзіны змяі, вужа і гаспадароў.*

| Галоўныя героі | Адносіны да рэчаіснасці | Характарыстыка |
|---|---|---|
| Вуж | Анямеў ад жаху, аслупянеў ад убачанага. | Добры. |
| Змяя | Упусціла яд у гладышы з малаком. | Зларадная,чэрствая, змяя-гадзюка. |
| Гаспадыня | Моцна зачыніла на засаўку камору і пайшла шукаць мужа, каб расказаць пра ўбачанае. | Спакойная, разважлівая. |

*Эпізод 2. Заданне 2 групе. Адносіны да ўчынка дзяцей.*

| Галоўныя героі | Адносіны да рэчаіснасці | Характарыстыка |
|---|---|---|
| Дзеці | Гулялі з вужынымі яйкамі, прагналі вужа з двара. | Бесклапотныя, не думаюць пра |

| | | |
|---|---|---|
| | | наступствы. |
| Вуж | Немаўляткам бяда пагражае. Паўзе, плача над сваім няшчасцем. | Бездапаможны. |
| Гаспадар | Асцярожненька збярыце яйкі і аднясіце туды, дзе ўзялі; зрабіце так, як было раней. | Разважлівы, спакойны, справядлівы, добры. |

*Эпізод 3.Праблемныя пытанні. "Вось я і адпомсціла за тваіх дзетак!"*

- Чаму, на вашу думку, ядавітая змяя вырашыла так жорстка расправіцца з сялянскай сям'ёй? (Яна хацела адпомсціць за смерць дзетак вужа; па-другое, так склалася, што змеі і ў прыродзе прыносяць смерць чалавеку, нездарма, каб ахарактарызаваць кагосьці, выкарыстоўваюць эпітэты *люты, смярцельны, злы*, *страшны* або параўнанне *як змяя*.)
- Ці згадзіўся б вуж з дзеяннямі змяі-гадзюкі, калі б гаспадар не загадаў дзецям аднесці яйкі на месца? (Вуж добры, у яго і думак не было помсціць дзецям.)
- Чаму вуж нават не заўважыў, з якой удзячнасцю на яго глядзела ўся сям'я? (Вуж вырашыў перакуліць гладышы з атручаным малаком, бо не жадаў смерці гаспадаровай сям'і. Не абавязкова, робячы дабро, абвяшчаць пра гэта ўсім на свеце. З другога боку, вуж аддзячыў за сваіх выратаваных дзетак.)
- Ці згодны вы з тым, што і самы люты звер за дабро дабром дзякуе? (Згодны.) Ці супадае гэта выказванне з асноўнай думкай твора? (Так.) Падбярыце сінонімы да слова дабрыня. (Дабро, спагада.)
- Паводле нашай легенды, паводле паводзін вужа і змяі добрым чалавек нараджаецца ці становіцца? (Мне здаецца, што нараджаецца. Хаця ў злога чалавека ёсць магчымасць стаць добрым, змяніцца.)

**V. Калектыўнае складанне плана легенды.**

1. Вуж-дамавік.
2. Не крыўдзіце дзетак!
3. Сустрэча са змяёй.
4. Атрутны яд.
5. Засаўка на каморы.
6. Парады гаспадара.
7. Перавернутыя гладышы.
8. Удзячнасць.

VI. **Рэфлексія. Прыём "Інтэрв'ю".** (Дзеці самі задаюць пытанні і адказваюць на іх).

- Мілана, што цябе больш за ўсё здзівіла на ўроку?
- Аліса, ці задаволена ты ўчынкамі галоўных герояў?
- Арцём, якое пытанне на ўроку было самым цікавым?

VII. Дамашняе заданне. Пераказ легенды.